# GRAMMAR REFERENCE

## Unit 1. Revision

### The verb *to be*: Present

### Дзеяслоў *TO BE* ў цяперашнім часе

| | |
|---|---|
| **BE** < (I) **am**<br>(we, you, they) **are**<br>(he, she, it) **is** | I'**m** (I **am**) a student.<br>You'**re** (you **are**) a student.<br>He'**s** (he **is**) a student. |

| | |
|---|---|
| **+** | I'**m** a student. He'**s** a student. You'**re** a student. |
| **–** | I'**m** (I **am not**) a teacher. He **isn't** a teacher. You **aren't** a student. |
| **?** | **Am** I a student? **Is** he a student? **Are** you a student? |

### The verb *to be*: Past

### Дзеяслоў *TO BE* ў прошлым часе

| | |
|---|---|
| **BE** < (I, he, she, it) **was**<br>(we, you, they) **were** | I **was** happy.<br>We **were** happy. |

| | |
|---|---|
| **+** | He **was** happy. They **were** happy. |
| **–** | He **wasn**'t sad. They **weren't** sad. |
| **?** | **Was** he happy? **Were** we sad? |

(S) is / was a student

Is / Was (S) a teacher?

(S) is / was **n't (not)** a teacher

## The verb *to be*: Future

## Дзеяслоў *TO BE* ў будучым часе

| | |
|---|---|
| **BE** < (I, we) **will / shall be**<br>(he, she, it, they, you) **will be** | I'**ll be** (**will / shall be**)11 this year.<br>He'**ll be** (**will be**) 11 this year. |

| | |
|---|---|
| **+** | I'**ll be** 11 this year. He'**ll be** 11 this year. |
| **–** | I **won't (shan't) be** 12 this year. He **won't be** 12 this year. |
| **?** | **Will** you **be** 12 this year? |

## Present Simple
## Цяперашні прошлы час

- Выкарыстоўваецца для абазначэння:
  1. Звычайных дзеянняў, якія паўтараюцца:

     I **drink** coffee in the morning.

  2. Фактаў у цяперашнім часе і агульнавядомых ісцін:

     My daughter **loves** ice cream. In autumn birds **fly** South.

- Выкарыстоўваецца са словамі *usually*, *every day*, *often*, *sometimes*, *always*.

### Адмоўныя сказы

Адмоўныя сказы ўтвараюцца шляхам ужывання **дапаможнага дзеяслова do** або **does** і часціцы **not**.

I **don't** drink coffee.
His parents **do not** understand his new hobby.
Our cat **does not** catch mice.
He **doesn't** play the guitar.

Прыслоўе **never** ужо змяшчае адмову, таму пры яго выкарыстанні ў сказе адмоўная часціца **not** не патрэбна.

My son **never** watches TV in the morning.

### Агульныя пытанні

Агульныя пытанні – гэта пытанні да ўсяго сказа. Агульныя пытанні ў Present Simple (акрамя пытанняў з дзеясловам *to be*) утвараюцца шляхам ужывання дапаможнага дзеяслова **do** або **does**. На першае месца ставіцца дапаможны дзеяслоў (1), на другое – дзейнік (2), на трэцяе – выказнік (3), далей ідуць дададзеныя члены сказа.

My friends play football at the weekends.
(1) **Do** (2) your friends (they) (3) play (4) football at the weekends?

I usually go to work on foot.
(1) **Do** (2) you usually (3) go (4) to work on foot?

Our cat likes fish very much.
**Does** your cat (it) like fish very much?

He often goes to the theatre.
**Does** he often go to the theatre?

## Альтэрнатыўныя пытанні

Альтэрнатыўнае пытанне можа ставіцца да любой часткі сказа. Яно прапануе выбар паміж двума асобамі, прадметамі, якасцямі і г.д. Яно ўтвараецца як агульнае пытанне і мае слова **or** (ці).

**Do** you play tennis **or** football?

## Спецыяльныя пытанні

Спецыяльныя пытанні можна задаваць да любога члена сказа. На першае месца ставіцца пытальнае слова (1), на другое – дапаможны дзейнік (2), на трэцяе – дзейнік (3), на чацвёртае – выказнік (4), далей ідуць дадныя члены сказа. Самыя распаўсюджаныя пытальныя словы: **What, Where, When, How, Why, How many (much), How often, What kind of, What sort of, What type of**.

We usually play football on the stadium every Saturday.

| 1 | 2 | 3 | | 4 | 5 |
|---|---|---|---|---|---|
| **Where** | do | you | (usually) | play | football? |
| **When** | do | you | (usually) | play | football? |
| **What** | do | you | (usually) | do | every Saturday? |

My brother likes rock music. He plays the guitar very well.
(1) Why (2) does (3) he (4) like (5) rock music?
How does he play the guitar?

My friend likes white roses.
(1) **What kind of flowers** (2) does (3) your friend (4) like?
(1) **What flowers** (2) does (3) your friend (4) like?

Usually we eat three times a day.
(1) How many times a day (2) do (3) you usually (4) eat?
How often do you usually eat?

## Пытанні да дзейніка

Пытанне да дзейніка пачынаецца толькі словам **Who** або **What**. Па сэнсе гэта пытанне, а па форме – апавядальны сказ, у якім Who / What з'яўляецца дзейнікам.

Пры яго пабудове дапаможныя глаголы **не ўжываюцца**, больш таго, пытальнае слова Who / What замяняе дзейнік.

They go to the cinema at weekends.

Who go**es** to the cinema at weekends?

Bad marks make me unhappy.

What mak**es** you unhappy?

| | |
|---|---|
| **+** | (S) [V(s)]<br><br>(I, we, you, they) **write**<br>(he, she, it) **writes**<br><br>I often **write** letters.<br>He often **writes** letters. |
| **–** | (S) do / does [not] [V]<br><br>(I, we, you, they) **don't write**<br>(he, she, it) **doesn't write**<br><br>I **don't write** poems.<br>He **doesn't write** poems. |
| **?** | do / does (S) [V]<br><br>**do** (I , we, they, you) **write**<br>**does** (he, she, it) **write**<br><br>**Do** you often **write** letters?<br>**Does** he often **write** letters? |

## Present Continuous

## Прошлы прадоўжаны час

Утвараецца з дапамогай дзейніка **to be** ў простым часе **(am / is / are)** і асноўнага дзейніка з канчаткам **-ing**.

• Выкарыстоўваецца для абазначэння:

1. Дзеянне, якое адбываецца на момант гутаркі (цяпер).

I **am doing** my homework at the moment.
My friends **are playing** football now.
John **is watching** TV.

2. Дзеянне, якое ахоплівае пэўны перыяд часу ў сучасны момант.

Mr Rambler **is travelling** around the world now.
She **is working** really hard this year.

- Выкарыстоўваецца са словамі *now*, *at the moment*.

| | |
|---|---|
| **+** | S am / is / are Ving<br><br>(I) **am writing**<br>(he, she, it) **is writing**<br>(we, you, they) **are writing**<br><br>**I'm** (I **am**) **writing** a letter now.<br>He'**s** (he **is**) **writing** a letter now.<br>We'**re** (we **are**) **writing** a letter now. |
| **–** | S am / is / are not Ving<br><br>(I) **am** (**I'm**) not **writing**<br>(he, she, it) **is not (isn't) writing**<br>(we, you, they) **are not (aren't) writing**<br><br>I **am not writing** a poem now.<br>He **isn't (is not) writing** a poem now.<br>We **aren't (are not**) writing a poem now. |
| **?** | am / is / are S Ving<br><br>**Am** (I) **writing**<br>**Is** (he, she, it) **writing**<br>**Are** (we, you, they) **writing**<br><br>**Am** I **writing** a letter now?<br>**Is** he **writing** a letter now?<br>**Are** we **writing** a letter now? |

# Past Simple

# Прошлы просты час

• Выкарыстоўваецца для абазначэння:

1. Дзеянняў, якія ўжо адбыліся ў мінулым і ніякім чынам не звязаны з цяперашнім момантам. Для абазначэння гэтых дзеянняў звычайна выкарыстоўваюцца такія словы і выразы, як: *yesterday*, *last* (*week*, *month*, *year*), *a day* (*week*, *month*, *year*) *ago*, *in 2000*:

We **went** fishing *last* Thursday.

2. Паслядоўнасці дзеянняў для апісання развіцця падзей у мінулым.

*Yesterday* I **came** home at 5 o'clock. Then I **had** a cup of tea. After that I **watched** TV.

3. Дзеянняў у мінулым, што паўтараліся, на якія указваюць словы і выразы: *every* (*day*, *week*, *month* ...), *usually*, *often*, *always* ...

Last summer we **went** fishing *every day*.

• Ужываецца са словамі *yesterday*, (*two days*) *ago*, *last* (*year / month* ...), *in 2003.*

## Правільныя і няправільныя дзеясловы

Усе дзеясловы англійскай мовы дзеляцца на **правільныя** (regular) і **няправільныя** (irregular). Правільныя дзеясловы ўтвараюць формы прошлага часу і дзеепрыметніка II ($V_3$) шляхам прыбаўлення да інфінітыва канчатка **-ed**:

paint – paint**ed**, reach – reach**ed**.

Yesterday I **played** football with my friends.
We **finished** our work at 10 o'clock.

Няправільныя дзеясловы па гістарычных прычынах маюць асобыя формы прошлага часу (другая форма дзеяслова) і дзеепрыметніка II (трэцяя форма дзеяслова). Гэтыя формы трэба запамінаць.

buy – bought, bring – brought, fight – fought, spend – spent, send – sent.

| |
|---|
| **Увага:** да формаў прошлага часу <u>няправільных</u> дзеясловаў ніякія **канчаткі не дадаюцца**! |

My parents **went** on holiday last week.
Jack **bought** a new CD two days ago.

## Адмоўныя сказы

Адмоўныя сказы ўтвараюцца шляхам ужывання дапаможнага дзеяслова **did** і адмоўнай часціцы **not**. У адмоўным сказе на першае месца ставіцца дзейнік, на другое – did not, на трэцяе – выказнік (у форме інфінітыва), далей ідуць дададзеныя члены сказа. **Did not** часта выкарыстоўваецца ў кароткай форме: **didn't.**

We **didn't go** there again.

Прыслоўе **never** ужо змяшчае адмову, таму пры яго выкарыстанні ў сказе адмоўная часціца **not** не патрэбна.

We *never* **went** there again.

## Пытальныя сказы

Пытальныя сказы ў Past Simple ўтвараюцца шляхам ужывання дапаможнага дзеяслова **did** (акрамя сказаў з дзеясловам *to be*).

## Агульные пытанні

**Агульнае пытанне** – гэта пытанне да ўсяго сказа. Ва ўсіх граматычных часах англійскай мовы ў агульным пытанні на першае месца ставіцца дапаможны дзеяслоў, на другое – дзейнік, на трэцяе – дзеяслоў у форме інфінітыва, далей ідуць дададзеныя члены сказа.

Кароткі адказ на агульнае пытанне будуецца так сама, як і ў Present Simple:

Did you have a good time? – **Yes, I did.**
Did they buy anything? – **No, they didn't. / No, they did not.**

## Спецыяльныя пытанні

Спецыяльныя пытанні задаюцца, калі трэба падрабязна высвятліць якія-небудзь дэталі. У спецыяльным пытанні на першае месца ставіцца пытальнае слова, на другое – дапаможны дзеяслоў, на трэцяе – дзейнік, на чацвёртае – выказнік у форме інфінітыва.

What **did** we do yesterday?
Where **did** you spend your last holiday?
When **did** he pass the exams?
Why **did** it happen to me?

## Пытанне да дзейніка

Асаблівасцю пытання да дзейніка з'яўляецца адсутнасць дакладна выражанага дзейніка (аб'екта пытання) і дапаможнага дзеяслова.

Дзейнікам з'яўляецца само пытальнае слова **who** / **what**. А паколькі ў пытанні няма дапаможнага дзеяслова, то сэнсавы дзеяслоў (выказнік) захоўвае сваю форму, у дадзеным выпадку форму прошлага простага часу.

*Who* **helped** you about the house?
*What* **went** wrong with the concert?

| | |
|---|---|
| **+** | S $V_2$<br><br>write – **wrote**<br>open – **opened**<br><br>He **wrote** a letter yesterday.<br>I **opened** the parcel last week. |
| **–** | S did not $V_1$<br><br>**did not write**<br>**did not open**<br><br>He **didn’t write** a letter yesterday.<br>He **didn’t open** the parcel last week. |
| **?** | did S $V_1$<br><br>**Did** he **write / open**?<br><br>**Did** he **write** a letter last week?<br>**Did** he **open** the parcel yesterday? |

# Unit 2

## Modal verb *have to*

## Мадальны дзеяслоў *have to*

Мадальны дзеяслоў **have to** ўжываецца для передачы неабходнасці выканаць якое-небудзь дзеянне:

I **have** to do it today, I can't leave it for tomorrow. – Я **павінен** зрабіць гэта сёння, я не магу пакінуць гэта на заўтра.
He can't play football with you now, he **has to** do his homework. – Ён не можа гуляць з вамі ў футбол цяпер, яму **трэба** рабіць дамашняе заданне.

Пытальная форма дзеяслова **have to** ўтвараецца шляхам ужывання дапаможнага дзеяслова **do**:

**Do I have** to do it? – Мне **трэба** гэта рабіць?
**Does he have** to write it? – **Ён павінен** напісаць гэта?

Адмоўная форма дзеяслова **have to** ўтвараецца шляхам ужывання дапаможнага дзеяслова **do** і адмоўнай часціцы **not:**

You do **not have** to stay. – Вам **неабавязкова** заставацца.
She **does not have** to stay. – Ёй **неабавязкова** заставацца.

Звычайна адмоўная форма дзеяслова **have to** выражае адсутнасць неабходнасці або адсутнасць ў неабходнасці дазволу з боку таго, хто гаворыць, выканаць дзеянне.

| **+** |
|---|
| I / we / you / they **have to** |
| He / she / it **has to** |
| I've got terrible toothache. I **have to go** to the dentist. |
| **–** |
| I / we / you / they **don't have to ...** |
| He / she / it **doesn't have to ...** |
| Ian **doesn't have to get up** early tomorrow. His lessons start at 12:30. |
| **?** |
| **Do** I / we / you / they **have to ...?** |
| **Does** He / she / it **have to ...?** |
| What time **do** you **have to get up** tomorrow? |

# Past Continuous

## Прошлы прадоўжаны час

- Выкарыстоўваецца для абазначэння:

1. Дзеянння, якое адбывалася ў пэўны момант у мінулым.

   Yesterday at 5 o'clock I **was doing** homework.

2. Дзеяння, на фоне якога адбылося другое дзеянне, якое, у сваю чаргу, **абавязкова** павінна выражацца дзеясловам у Past Simple. Past Simple звычайна ўжываецца са злучнікам **when**:

   He **was walking** home **when** somebody called his name.

3. Двух паралельных дзеянняў, якія адбываліся ў пэўны момант у мінулым. Past Continuous звычайна ўжываецца са злучнікам **while**:

   The boy **was reading**, *while* the girl **was playing** the piano.

Ва ўсіх тыпах сказаў прадоўжанага часу магчыма ўжываць некалькі сэнсавых дзеясловаў з адным дапаможным дзеясловам пры адным дзейніку:

She **was watching** TV <u>and</u> **talking** on the phone.

- Ужываецца са словамі *then*, *at that moment*, *at 5 o'clock yesterday*, *when you came.*

Гэтыя словы з'яўляюцца або акалічнасцю месца, або выразам, які апісвае другое дзеянне ў мінулым. Пры гэтым ні сам працэс дзеяння, ні канец працяглага дзеяння невядомы. Падкрэсліваецца сам працэс дзеяння, яго працягласць. Момант, у які адбываецца дзеянне, што цікавіць нас, часта перадаецца другім кароткім дзеяннем у Past Simple Tense.

| | |
|---|---|
| I was writing a letter to my friend | ... at 5 o'clock yesterday. |
| | ... from 5 to 6 on Sunday. |
| | ... when my brother came. |
| | ... while my mother was cooking dinner. |

Прошлы прадоўжаны час утвараецца, як і цяперашні просты час, шляхам ужывання дапаможнага дзеяслова **to be** і сэнсавага дзеяслова ў *-ing* форме. Пры гэтым дзеяслоў **to be** ўжываецца ў форме прошлага часу (**was, were**).

| | |
|---|---|
| (I, he, she) was<br>(we, you, they) were | + V-ing |

I **was reading** a book. – Я чытаў кнігу.
They **were playing** chess. – Яны гулялі ў шахматы.
He **was writing** a letter. – Ён пісаў пісьмо.

Дзеяслоў **to be (was, were)** з'яўляецца ў дадзеным выпадку службовым і выкарыстоўваецца для ўтварэння пытальнай ці адмоўнай формы. Каб задаць пытанне ў Past Continuous Tense, трэба паставіць дзеяслоў **to be** (у адпаведнай форме: **was / were**) перад дзейнікам. Каб утварыць адмоўную форму, трэба паставіць адмоўе **not** пасля дзеяслова **to be**:

| | |
|---|---|
| **+** | He **was playing** at 3 o'clock. |
| **–** | He **was not playing** at 3 o'clock. |
| **?** | **Was** he **playing** at 3 o'clock? |

Yes, he was. No, he was not. (No, he wasn't.)
was not = wasn't
were not = weren't

| | |
|---|---|
| **+** | S was / were Ving<br><br>(I, he, she, it) **was writing**<br>(we, you, they) **were writing**<br><br>I **was writing** a letter at 5 o'clock yesterday.<br>We **were opening** the parcel at that moment. |
| **–** | S was / were not Ving<br><br>(I, he, she, it) **was not** (wasn't) **writing**<br>(we, you, they) **were not** (weren't) **writing**<br><br>I **wasn't (was not)** writing a poem when you came.<br>We **weren't (were not)** writing a poem then. |
| **?** | was / were S Ving<br><br>**Was** (I, he, she, it) **writing**<br>**Were** (we, you, they) **writing**<br><br>**Was** he **writing** a letter then?<br>**Were** they **writing** a letter then? |

| **Past Simple (прошлы просты час) абазначае** | **Past Continuous (прошлы прадоўжаны час) абазначае** |
|---|---|
| • закончанае дзеянне ў мінулым (г.зн. здзейснены ў мінулым факт):<br>John **did** his homework yesterday. **–** Учора Джон зрабіў дамашнюю работу. | • працяглае дзеянне ў мінулым, якое пачалося да пэўнага моманту ў мінулым і працягвалася ў той момант:<br>John **was doin***g* his homework when his mother came home. **–** Джон рабіў дамашнюю работу, калі мама прыйшла дадому. |
| • падзеі ў мінулым, якія адбываліся адна за адной:<br>John **got up** early, **washed**, and **did** his morning exercises. – Джон устаў рана, памыўся і зрабіў зарадку. | • падзеі, на фоне якіх адбываецца дзеянне:<br>When I got up yesterday, it **was raining.** – Калі я ўчора ўстаў, ішоў дождж. |

# Unit 3

## Pronouns *some*, *any*, *no*

## Займеннікі *some*, *any*, *no*

Каб паказаць на некаторую колькасць (некалькі) прадметаў, якія лічацца, ці некаторую колькасць рэчыва, у англійскай мове займеннік **some** ўжываецца ў сцвярджальных сказах, а займеннік **any** – у пытальных і адмоўных сказах.

| | |
|---|---|
| **+** | **some** *некалькі, няшмат* |
| **?** | **any** *колькі-небудзь* |
| **–** | **not an, no** *не, нісколькі* |

Take **some** glasses from that shelf. – Вазьміце некалькі шклянак з той паліцы.
Don’t take **any** books from the case. – Не бярыце кніг з шафы.
Have you got **any** money? – У цябе ёсць колькі-небудзь грошай?

Займеннік **no** мае адмоўнае значэннее *ніякі* і паясняе назоўнік, напрыклад:

There is **no** milk in the jug. – У збане няма малака.

| | + | – | ? |
|---|---|---|---|
| singular countable nouns *(e.g. cat)* | **a / an** | **not a(an) / no** | **a / an** |
| singular plural nouns *(e.g. cats)* | **some** | **not any / no** | **any** |
| uncountable nouns *(e.g. milk)* | **some** | **not any / no** | **any** |

# Pronouns *something*, *anything*, *nothing* / *somebody*, *anybody*, *nobody*

# Займеннікі *штосьці*, *што-небудзь*, *нішто* / *хтосьці*, *хто-небудзь*, *ніхто*

Займеннікі **some**, **any**, **no** ў спалучэнні са словамі **body**, **thing** утвараюць складаныя займеннікі: **somebody** – **anybody** – **nobody**; **something** – **anything** – **nothing**; у адносінах да іх прымяняюцца тыя ж правілы ўжывання ў сказах розных тыпаў, што і ў адносінах да **some**, **any**, **no**.

| | | |
|---|---|---|
| + | **something** *штосьці* | **somebody** *хтосьці* |
| ? | **anything**<br>*сёе-тое, што-небудзь* | **anybody**<br>*сёй-той, хто-небудзь* |
| – | **nothing** *нішто*<br>**not anything** *нічога* | **nobody** *ніхто*<br>**not anybody** *нікога* |

Займеннікі, утвораныя з дапамогай **-body**, ужываюцца толькі ў адносінах да людзей і спалучаюцца з дзеясловам у адзіночным ліку. Займеннікі, утвораныя з дапамогай **-thing**, ужываюцца ў адносінах да неадушаўлённых прадметаў і паняццяў:

There is **somebody** in the office. – У пакоі нехта ёсць.
Is there **anybody** at home? – Дома ёсць хто-небудзь?
There **something** wrong with him. – З ім нешта здарылася.

Калі ў сказе ўжываюцца адмоўныя займеннікі **nobody**, **nothing**, то адмоўная часціца **not** не патрэбна, паколькі ў англійскай мове можа быць толькі адно адмаўленне.

**Nobody** knows **anything** about it. – Ніхто нічога не ведае пра гэта.

I found **nothing** interesting there. – Я не знайшоў нічога цікавага.

| | **+** | **–** | **?** |
|---|---|---|---|
| things | **something** | **not anything**<br>**nothing** | **anything** |
| people | **somebody**<br>**someone** | **not anybody / anyone**<br>**nobody / no-one** | **anybody**<br>**anyone** |

# Pronouns *few* / *a few*, *little* / *a little*

# Займеннікі *мала* / *нямнога* / *некалькі*

Займеннік **few** *мала* ўжываецца толькі з назоўнікамі, якія лічацца, у множным ліку:

He has few friends. He is very lonely. – У яго мала сяброў. Ён вельмі адзінокі.

Займеннік **little** *мала* ўжываецца з назоўнікамі, якія не лічацца (абстрактныя паняцці, рэчывы):

There is **little** milk in the cup. – У кубку мала малака.
I have very **little** time. – У мяне вельмі мала часу.

Спалучэнне **a few** *некалькі* ўжываецца толькі з назоўнікамі, якія лічацца, з назоўнікамі, якія не лічацца, ужываецца спалучэнне **a little** *нямнога*:

Will you give me **a little** water? – Ці не дадзіце мне нямнога (крыху) вады?
I bought **a few** apples. – Я купіў нямнога (некалькі) яблыкаў.

Такім чынам, займеннікі **a few**, **a little** абазначаюць *нямнога*, *але дастаткова*, а займеннікі **few**, **little** – *мала*. Параўнайце:

I know **little** about painting. – Я мала ведаю пра жывапіс.
I know **a little** about painting. – Я сёе-тое ведаю пра жывапіс.

There are **few** flowers in my garden. – У маім садзе мала (амаль няма) кветак.
There are **a few** flowers in my garden. – У маім садзе ёсць нямнога кветак.

| | | |
|---|---|---|
| (a) **little** + uncountable nouns<br>(*e.g.* (a) *little water)* | | **(a) few** + plural nouns<br>(*e.g.* (a) *few books)* |
| **a little** = some, but not much<br>(a positive idea)<br>*I speak a little Italian.*<br>*She didn't eat anything but she drank a little water.* | | **a few** = some, but not many<br>(a positive idea)<br>*I speak a few words of Italian.*<br>*Yesterday I wrote a few postcards.* |
| **little** = nearly no, nearly nothing<br>(a negative idea)<br>*There was* ***little*** *food in the fridge. It was nearly empty.* | | **few** = nearly no (a negative idea)<br>*There were very* ***few*** *people in the park. It was nearly empty.* |

# Unit 4

## Passive Voice

## Залежны стан

### Present Simple Passive

Стан – гэта катэгорыя дзейніка, якая паказвае, ці з’яўляецца дзейнік сказа стваральнікам або аб’ектам дзеяння, выражанага выказнікам. У англійскай мове ёсць два станы: the Active Voice (незалежны стан) і the Passive Voice (залежны стан).

Залежны стан ужываецца, калі выканаўца дзеяння відавочны ці неістотны або калі дзеянне ці яго вынік больш цікавыя, чым выканаўца. Залежны стан утвараецца з дапамогай дзеяслова **to be** ў адпаведным часе і III формы сэнсавага дзеяслова ($V_3$).

| Present Simple Passive |
|---|
| **am**<br>**is** + $V_3$<br>**are** |

Параўнаем незалежны стан з залежным станам:

*Active Voice*

Tom **does** homework. – Том выконвае дамашнюю работу.

*Passive Voice*

Homework **is done** by Tom. – Дамашняя работа выконваецца Томам.

Як і ў беларускай мове, назоўнік, які іграе ролю дапаўнення ў незалежным стане, у сказе залежнага стану становіцца звычайна дзейнікам.

Somebody **cleans** the office every day.

The office **is cleaned** every day.